ПЛАЦДАРМ
Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь
Выпуск №12 (75)



■ Весткі з войскаў

# Сцяг — дывізіёну

**77-му асобнаму рэактыўнаму артылерыйскаму дывізіёну ўручылі Баявы Сцяг. Воінскі рытуал, які адбыўся ў 336-й рэактыўнай артылерыйскай брыгадзе, правёў начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны генерал-маёр Алег БЕЛАКОНЕЎ.**

Баявы Сцяг, які з'яўляецца сведчаннем баявога прызначэння, гісторыі і заслуг вайсковай часці, а таксама прыналежнасці яе да Узброеных Сіл, брыгада атрымала ў 45-ю гадавіну з дня ўтварэння. Сімвал воінскага гонару, доблесці і славы асвяціў служыцель царквы, і толькі потым падраздзяленне ганарова пранесла яго ў страявым маршы.

На ўзбраенні дывізіёна — рэактыўная сістэма залпавага агню «Паланэз», якую распрацавалі на прадпрыемствах абароннага сектара нашай краіны. Па некаторых характарыстыках яна не мае аналагаў у свеце. Нагадаем, у кастрычніку вайскоўцы дывізіёна ўзялі ўдзел у стрэльбавых выпрабаваннях мадэрнізаванага комплексу «Паланэз-М» з павелічэннем далёкасці пуску да 300 кіламетраў. У выніку была пацверджана высокая дакладнасць, вялікая далёкасць пуску і манеўранасць баявой машыны.

# ВАЛОДАЦЬ ІНФАРМАЦЫЯЙ

## Комплексы і сродкі сувязі паступілі на ўзбраенне беларускай арміі

**32 камплекты тэхнікі былі ўручаны прадстаўнікам злучэнняў і вайсковых часцей у Асіповічах на тэрыторыі 263-й базы захоўвання, рамонту і ўтылізацыі сродкаў сувязі. Перададзеная тэхніка дазваляе забяспечваць поўны комплекс тэлекамунікацыйных паслуг, патрабаванні аб якіх прад'яўляюцца да сістэмы кіравання.**


Начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны генерал-маёр Алег БЕЛАКОНЕЎ уручае тэхнічныя пашпарты на новую тэхніку.

Як адзначыў падчас цырымоніі ўручэння **начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны генерал-маёр Алег БЕЛАКОНЕЎ**, згодна з вопытам лакальных войнаў і ўзброеных канфліктаў, поспех дасягаецца тым бокам, які валодае сітуацыяй на полі бою і апярэджвае саперніка ў прыняцці рашэнняў.

— Невыпадкова адным з прыярытэтных напрамкаў будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл вызначана развіццё сістэмы кіравання войскамі, тэхнічнай асновай якой з'яўляецца сістэма сувязі, — перакананы першы намеснік міністра абароны. — Сёння працягваецца планавае нарошчванне тэмпаў тэхнічнага аснашчэння сучаснымі сродкамі кіравання. Разам з мадэрнізацыяй існуючых сродкаў закупляюцца і новыя, айчынныя распрацоўкі тэхнікі сувязі. Мы ўжо адышлі ад практыкі пастаўкі ў войскі асобных адзінак новай тэхнікі. Пераўзбраенне ідзе ў планавым парадку адразу ў цэлых падраздзяленнях.

Пасля таго як былі ўручаны тэхнічныя пашпарты, асабовы склад і ваенная тэхніка раз'ехаліся па вайсковых часцях краіны. Як заўважыў **старшыня Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта генерал-маёр Алег ДВІГАЛЕЎ**, абыякавых людзей у войсках сёння няма. «У нас наладжана зваротная сувязь з падраздзяленнямі, дзякуючы чаму прадпрыемствы могуць лепш арыентавацца ў мадэрнізацыі тэхнікі, — растлумачыў ён. — Гэта дазваляе развівацца і ствараць канкурэнтаздольную прадукцыю ваеннага прызначэння, якая запатрабавана на знешніх рынках».



— Мы святкуем стагоддзе з дня ўтварэння Узброеных Сіл, але порах заўсёды трэба трымаць сухім і быць гатовым да выканання любых задач, якія могуць паўстаць, — удакладніў Алег Белаконеў. — Ужо распрацаваны і зацверджаны план раптоўных праверак. Год будзе не менш насычаны ў плане вучэнняў. Каля чатырох тысяч вайскоўцаў прызавуць з запасу для даўкамплектавання. Вялікая колькасць асабовага складу прыбудзе і на зборы рэзервістаў.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■ Даслоўна

# ВАЙСКОЎЦЫ З ПУНСОВЫМІ ПАГОНАМІ

## Ці ўсе суворaўцы становяцца афіцэрамі і хто з іх у перспектыве зойме адказныя ў дзяржаве пасады?

**Звычайныя школьнікі з зайздрасцю глядзяць на сваіх равеснікаў у прыгожай чорнай форме з пунсовымі пагонамі. Суворaўцы ж могуць толькі марыць пра пад'ём і адбой не па камандзе, адвольны распарадак дня і спатканні да позняй ночы. У дарослых не па гадах падлеткаў іншыя турботы — дасканала падрыхтавацца да заняткаў, падцягнуцца духоўна і фізічна, каб па праве звацца гонарам Узброеных Сіл.**


Начальнік Мінскага суворaўскага ваеннага вучылішча палкоўнік Аляксандр НАВУМЕНКА сам некалі насіў пунсовыя пагоны.

Яшчэ Кацярына II называла суворaўскае «рассаднікам вялікіх людзей», а нехта не менш знакаміты казаў пра вучылішча як пра «кузню геніяў». І сапраўды, сярод яго выпускнікоў — вядомыя военачальнікі, спартсмены, грамадскія дзеячы... Наколькі перспектыва афіцэрскай прафесіі прывáблівае сучасную моладзь, мы пагутарылі з **начальнікам Мінскага суворaўскага ваеннага вучылішча палкоўнікам Аляксандрам НАВУМЕНКАМ.**

***— Аляксандр Віктаравіч, ці шмат ахвотных папоўніць шэрагі суворaўцаў?***

— Пачынаючы з 2015-га колькасць кандыдатаў на паступленне ў Мінскае суворaўскае ваеннае вучылішча няўхільна расце. Калі два гады таму было 238 ахвотных, то сёлета суворaўцамі хацелі стаць 315 чалавек. У выніку з улікам праходжання медыцынскай камісіі, прафесійнага адбору і ацэнкі фізічнай падрыхтоўкі форму з пунсовымі пагонамі адзелі 68 чалавек.

***— Ці прызвычаіліся ўчарашнія шасцікласнікі да жыцця па рэжыме?***

— Дзеці трапілі ў абсалютна іншую атмасферу, пачалі жыць згодна з распарадкам дня, побач няма мамы і таты, але малышы-суворaўцы паступова ўваходзяць у каляіну. З жаданнем, ініцыятывай, нават настойлівасцю вучацца. Вынікі, якія яны на дадзены момант паказваюць, выклікаюць аптымізм. Хоць як выпускнік Мінскага суворaўскага ваеннага вучылішча, павінен сказаць, што, нават у тых, хто выдатна здаў уступныя іспыты, у сценах навучальнай установы пасп яховасць падае. І гэта натуральна: чалавек трапляе ў новую сістэму, дзе існуюць павышаныя патрабаванні да навучання. Уплывае і тое, што ўстанова закрытая, дзеці аднолькава адзеты, усе ідэнтычна харчуюцца, у іх адзіны распарадак дня, роўная колькасць часу на самастойную падрыхтоўку і заняткі спортам. Але менавіта ў такіх умовах падлетак, адкінуўшы ўсё шалупінне, можа паказаць, што ён з сябе ўяўляе, і пачынае фарміравацца як асоба.

***— Амаль 30 гадоў таму вы выйшлі са сцен суворaўскага вучылішча. Ці шмат з таго часу змянілася?***

— Прынцыпова не змянілася нічога. За выключэннем асобных педагогаў, выкладчыкі вучылішча маюць першую або найвышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю. Па-ранейшаму адзіны да ўсіх падыход у плане патрабавальнасці, захоўваюцца традыцыі. Вядома, часы мяняюцца. Патрабаванні — як да працэсу адукацыі, так і да кругагляду суворaўцаў — такія ж, як і да ўсёй моладзі. Калі я вучыўся, першыя камп'ютары толькі з'яўляліся, і мы пачыналі знаёміцца з гэтым цудам тэхнікі. Зараз Мінскае суворaўскае ваеннае вучылішча па сваёй вучэбна-матэрыяльнай базе забяспечана ўсім сучасным. У нас выдатны шматфункцыянальны спартыўны комплекс. Ідзём або ў нагу з часам, або нават апераджаем яго. Мяняецца праграма — іншы і працэс навучання, але духоўны, маральны і патрыятычны складнікі выхавання застаюцца нязменнымі.

***— Раней у суворaўскае паступалі ў асноўным дзеці вайскоўцаў. Якая тэндэнцыя сёння і ці ёсць пэўныя прывілеі для афіцэрскіх дзяцей?***

— Гэта памылковае меркаванне, што ў суворaўскае вучылішча перш за ўсё паступаюць дзеці ваеннаслужачых, прычым маюць пэўныя льготы. Па-першае, няма ніякіх ільгот! Па-другое, калі я тут вучыўся, магчыма, працэнт абітурыентаў з такіх сем'яў быў вышэйшы. У большай ступені гэта было абумоўлена падзеямі ў Афганістане, калі суворaўскае вучылішча стала прытулкам для многіх сірот. Паступалі сюды і дзеці тых вайскоўцаў, якія служылі ў савецкай групе войскаў за мяжой. Цяпер мы жывём у адзінай дзяржаве, і працэнт навучэнцаў у Мінскім суворaўскім ваенным вучылішчы з дзяцей ваеннаслужачых вагаецца ад сямі да дзесяці. У той час як дзеці з сем'яў рабочых і служачых складаюць дзесьці 75%. Прычым большасць суворaўцаў не мінчане. І гэта нягледзячы на тое, што ў абласных цэнтрах адкрыты ліцэі МУС, у многіх гарадах існуюць кадэцкія вучылішчы, створаны ваенна-патрыятычныя класы, дзе вучыцца шмат таленавітых і мэтанакіраваных дзяцей.

***— А ці не канкурэнты яны для вас?***

— Усё больш маладых людзей маюць патрэбу ў ваенна-патрыятычнай скіраванасці ў сваім навучанні і выхаванні. На жаль, многія ўяўляюць Мінскае суворaўскае па парадзе, прыгожай форме, таму думаюць, што патрабаванні да тых, хто паступае сюды, вельмі высокія. Але рыхтуючыся да сістэмы кадэцкай адукацыі, дзеці прызвычайваюцца да таго, што ў пэўнай ступені існуе і ў нас. Сутнасць не ў тым, носяць яны форму ці не. У іх дакладна арганізаваны працэс навучання. Акрамя таго, і ў суворaўскім, і ў кадэцкіх вучылішчы вялікая ўвага ўдзяляецца духоўна-маральнаму і фізічнаму выхаванню, сацыякультурнаму развіццю падлеткаў. Гэта не канкурэнцыя, а дзяржаўная справа, правільны кірунак далейшага развіцця ў навучанні і выхаванні падрастаючага пакалення. Праз 25—30 гадоў асноўныя вызначальныя пасты ў дзяржаве зоймуць людзі, якія былі выхаваны ў межах любові да Радзімы, адказнасці за яе будучыню.

***— Суворaўцы заўсёды былі на галаву вышэйшыя за звычайных школьнікаў...***

— У вучылішчы існуе свой вучэбны план. Вядома, пабудаваны ў межах праграмы Міністэрства адукацыі. Суворaўцы на павышаным узроўні вывучаюць англійскую мову і фізіку. Этыка, эстэтыка, танцы — гэта не проста «разынка» вучылішча. За гэтым стаяць планавыя заняткі, здача залікаў. У межах ваенна-патрыятычнага выхавання хлопцы ўдзельнічаюць практычна ва ўсіх дзяржаўных мерапрыемствах, маюць зносіны з правільнымі людзьмі, у тым ліку з тымі, хто калісьці абараняў Айчыну або цяпер служыць ёй. Акрамя таго, што ў нас створана свая праграма ваеннай падрыхтоўкі, суворaўцы выязджаюць у вайсковыя часці, дзе знаёмяцца як з побытам, так і з арганізацыяй баявой падрыхтоўкі ваеннаслужачых. Нягледзячы на розніцу ва ўзросце, далучаюцца да актыўных дзеянняў. Яны такія ж вайскоўцы, толькі пагоны ў іх пунсовыя.

***— З малых гадоў прызвычаіўшыся да амаль армейскага ўкладу жыцця, ці гатовы падлеткі да таго, што чакае іх па-за сценамі ўстановы?***

— Яны не замкнёныя ў вучылішчы. У межах шматлікіх спаборніцтваў і конкурсаў суворaўцы маюць зносіны са сваімі аднагодкамі, танцаваць яны вучацца таксама не адзін з адным. Не кожныя бацькі могуць дазволіць свайму дзіцяці мінімум дзевяць экскурсій на год, прычым па розных музеях і не толькі сталіцы. Далёка не ўсе могуць знайсці час, каб хоць раз на два месяцы звадзіць сваё дзіця ў тэатр. Фарміруючыся ў закрытым калектыве як асоба, чалавек не можа надзець на сябе маску. Хлопцы выхоўваюцца хоць і ў маленькім, але ў мужчынскім калектыве, таму адказнасць перад сваімі таварышамі закладваецца ўжо цяпер. З улікам узросту мы ставімся да іх як да дзяцей, але раз ужо яны адзелі форму, пагоны, то павінны выконваць правілы, за парушэнне якіх можна панесці адпаведную адказнасць: не пайсці, напрыклад, у звальненне.

***— Ці шмат хлопцаў сыходзіць з дыстанцыі на шляху да афіцэрскіх пагонаў?***

— Большасць (ад 72 да 84%) нашых выпускнікоў паступае ў Ваенную акадэмію або на ваенныя факультэты іншых ВНУ. Многія становяцца генераламі: выпускнікамі Мінскага суворaўскага ваеннага вучылішча з'яўляюцца дзяржаўны сакратар Савета бяспекі, міністр абароны, два яго намеснікі, камандуючы сіламі спецыяльных аперацый і іншыя вядомыя ў краіне людзі. Робяць свой выбар нашы выхаванцы і на карысць Акадэміі МУС, Інстытута пагранічнай службы, Універсітэта грамадзянскай абароны МНС. Але як вызначыць каштоўнасць чалавека, калі пасля заканчэння суворaўскага вучылішча ён стане не ваенным, а шыкоўным грамадзянскім хірургам? Ці меншую карысць дзяржаве ён прынясе, калі ў якасці мастака, спевака або спартсмена будзе праслаўляць сваю Радзіму? Самае галоўнае для нас — выхаваць адукаванага, патрыятычна настроенага, здаровага, усебакова развітога і мэтанакіраванага грамадзяніна сваёй дзяржавы, адказнага за яе будучыню.

***— У грамадстве склалася меркаванне, што прэстыж афіцэрскай прафесіі ўпаў. Маўляў, сёння нямодна насіць пагоны, гэта не тая сфера, якая высока аплачваецца...***

— Абарона Радзімы ні ў якія часы не была справай прыбытку. Скажыце, колькі патрэбна запрасіць у дзяржавы грошай, каб абараніць сваю маці, дзіця, выратаваць уласны дом? Шмат нараканняў у адрас МУС, але, калі прыходзіць бяда, куды звяртаюцца перш за ўсё? Калі ж праблемы са здароўем, ніхто не пытаецца ва ўрача, колькі той зарабляе. Не пытаемся пра гэта і ў бізнесмена, чалавека, які працуе каля станка, у полі. А каб у іх была магчымасць развівацца, нараджаць дзяцей, будаваць дом, мы павінны забяспечыць мірнае неба над галавой. Няхай той жа бізнесмен прыносіць карысць сваёй краіне ў іншым, мы ж выбралі прафесію абараняць Радзіму для таго, каб было спакойна ўсім астатнім. Некаторыя кажуць: маўляў, навошта патрэбны вайскоўцы, калі няма вайны. Можа, таму і няма, бо сёння ёсць мы.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*